**ВОДЗЫЎ**

**на аўтарэферат дысертацыі Сацукевіча Івана Іванавіча «Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)»**

прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Аўтарэферат дысертацыі І. І. Сацукевіча прысвечаны даследаванню ўрбананіміі Мінска ў перыяд з 1793 па 1991 г. Гэта тэма надзвычай актуальна ў сувязі з тым, што горад Мінск з'яўляецца сталіцай Рэспублікі Беларусь. Усім хочацца ведаць паходжанне назваў сталічных вуліц, плошчаў, мікрараёнаў, станцый метро. Тапанімія Мінска яшчэ ніколі не была тэмай асобнага даследавання ў гістарычнай навуцы. Важна, што вынікі даследавання ўжо выкарыстаны для найменавання новых вуліц горада, станцый метро, паркаў і сквераў. І гэта работа будзе працягвацца і надалей. Назвы забытых вёсак, урочышчаў і прадмесцяў атрымаюць другое жыццё ў найменнях новых гарадскіх вуліц, паркаў і мікрараёнаў. Даследаванне І. І. Сацукевіча рэалізавана з выкарыстаннем сучасных навуковых метадаў з прыцягненнем вялікага масіву архіўных дакументаў і прадстаўляе значную навуковую каштоўнасць.

У "Агульнай характарыстыцы працы" саіскальнікам ставяцца мэта і задачы даследавання. Вызначаюцца прадмет і аб'ект даследавання, а таксама падкрэсліваецца навуковая навізна. У першай главе саіскальнік акрэсліў ступень даследавання праблематыкі і прааналізаваў гістарыяграфію ўрбананіміі Мінска (1793–1991 гг.). Пры гэтым адзначыў, што ўнутрыгарадскія назвы Мінска ў 1793–1991 гг. дагэтуль не з'яўляліся прадметам спецыяльнага гістарычнага даследавання.

У другой главе аналізуецца ўрбананімная сітуацыя ў перыяд знаходжання Мінска ў складзе Расійскай імперыі, высвятляюцца асноўныя характэрныя рысы і фактары, якія ўплывалі на ўрбананімны ландшафт

горада. Выдзяляюцца спосабы – аўтаномны і інстытуцыянальны – фарміравання ўрбананіміі Мінска.

У трэцяй главе даецца аналіз тапанімічнай сітуацыі, якая склалася ў 1917–1944 гг. Разглядаюцца кардынальныя перамены, якія адбыліся ва ўрбананімнай прасторы Мінска ў 1917–1922 гг., калі ўлады пачалі разглядаць назвы вуліц і плошчаў у якасці ідэалагічнага сродку ўздзеяння на насельніцтва. Робіцца выснова, што вырашальным фактарам усіх перайменаванняў у Мінску ў 1917–1922 гг. была змена палітычнай улады.

У чацвёртай главе адлюстравана фарміраванне ўрбананімнага ландшафту Мінска ў 1944–1991 гг. Даецца аналіз назваў вуліц і плошчаў Мінска ў перыяд, які характарызуецца рэзкім ростам колькасці ўрбанонімаў, а таксама разглядаюцца змены ў назвах раёнаў, вёсак, уключаных у межы горада, рабочых пасёлкаў, мікрараёнаў і зялёных масіваў, якія ў 1944–1991 гг. сталі неад’емнай часткай сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця горада.

Заключэнне саіскальнік сфармуляваў у выглядзе чатырох пунктаў. У кожным з іх прысутнічаюць спасылкі на ўласныя публікацыі. Прыведзеныя высновы адпавядаюць мэце і задачам, пастаўленым ў пачатку даследавання, і не выклікаюць заўваг.

Змест аўтарэферата дысертацыі “Урбананімія Мінска (1793–1991 гг.)” дазваляе зрабіць выснову пра тое, што прадстаўленая да абароны дысертацыя І. І. Сацукевіча з’яўляецца самастойным і арыгінальным даследаваннем, а яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

кандыдат гістарычных навук,
дацэнт кафедры ўсеагульнай
гісторыі і методыкі выкладання
гісторыі Беларускага дзяржаўнага
педагагічнага ўніверсітэта
імя Максіма Танка Д. У. Дубінін

29.05.2025

Подпіс Дубініна Д У
засведчую намеснік начальніка АК БДПУ